УДК 008

# МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ ВА ЎМОВАХ СУЧАСНАЙ МАСАВАЙ КУЛЬТУРЫ

**Алянькова Юлія Васільеўна**
дацэнт кафедры філасофіі ўстановы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”,
кандыдат культуралогіі, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)
alenkova@msu.by

*У артыкуле раскрываюцца сутнасныя характарыстыкі сучаснай масавай культуры, якія аказваюць уплыў на развіццё мастацкай творчасці, і ставіцца пытанне аб задачах сучаснай гуманітарнай адукацыі па захаванню мастацкіх каштоўнасцяў.*

Масавая культура – гэта «дамінуючы ў масавым грамадстве тып культуры, арыентаваны на задавальненне і фарміраванне запытаў шырокіх слаёў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

насельніцтва праз распаўсюджванне сродкамі масавай камунікацыі стандартызаваных прадуктаў, якія ствараюцца "індустрыяй забаў"» [3]. Масавая культура – прадукт індустрыяльнай эпохі, рынкавай эканомікі, навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, масавага грамадства. У постіндустрыяльным грамадстве масы становяцца сілай хутчэй сімвалічнай, рассеянай за маніторамі гаджэтаў, з'яўляюцца новыя формы калектыўнай і індывідуальнай ідэнтычнасці, звязаныя з узнікненнем віртуальнай прасторы. Калі для гуманітарнай думкі сярэдзіны-другой паловы XX стагоддзя было характэрна крытычнае стаўленне да масавай культуры, характарыстыка яе як нізкапробнай і проціпастаўленне ёй культуры элітарнай, высокай, то сёння гэтыя грані сціраюцца, і масавую культуру прызналі аб'ектыўнай непазбежнасцю сацыякультурнага развіцця сучаснасці.

Відавочна, што і адукацыя развіваецца ў сацыякультурных рэаліях, якія фарміруюцца масавай культурай. Гэты тып культуры аказвае магутнае ўздзеянне на асобу сучаснага маладога чалавека.

Вылучым тыя тэндэнцыі масавай культуры, аналіз якіх нам здаецца найбольш значным для бачання перспектыў развіцця сучаснай гуманітарнай адукацыі.

Па-першае, гэта шоуізацыя культуры. Сучасная моладзь сфармавана эпохай ўсёпранікальнага шоу (на тэлебачанні, у Інтэрнэце, у школе, у жыцці), якое адказвае вечнай патрэбе людзей у відовішчах. Шоу (ад англ. Show – паказ, прадстаўленне – відовішчнае пастановачнае мерапрыемства забаўляльнага характару, якое дэманструецца шырокай публіцы. Яго галоўная задача – пацешыць спажыўца і атрымаць прыбытак.

Важна адзначыць, што відовішчнасць сама па сабе не з'яўляецца характарыстыкай толькі масавай культуры. Відовішчнасць суправаджае культурнае існаванне чалавецтва з моманту яго ўзнікнення, ад першабытных абрадаў і рытуалаў і да сучаснасці. Старажытнаўсходнія містэрыі, антычныя дыянісійскія дзействы, сярэднявечны карнавал... У гэтым сэнсе відовішча з'яўляецца своеасаблівым люстэркам эпохі. Але не ўсякае відовішча – шоу. Напрыклад, параўнаем шоу і тэатр.

На першы погляд тэатр і шоу аб'ядноўвае многае. І тое, і іншае – віды мастацтва, якія ўспрымаюцца слыхам і зрокам, якія патрабуюць прасторавай пабудовы і развіцця дзеяння ў часе. І тэатр, і шоу – гэта сінтэтычныя віды мастацтва, якія злучаюць у сабе слова, музыку, рух і інш.

Аднак тэатр і шоу прынцыпова розныя па сваёй прыродзе. Тэатр спрадвеку з'яўляўся сацыякультурным інстытутам, які не толькі забаўляў публіку, але і выхоўваў яе, падымаючы сур'ёзныя сацыяльныя праблемы. На яго была ўскладзена функцыя транслятара мадэляў сацыяльных



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паводзінаў. Стагоддзямі ён фарміраваў свядомасць людзей, іх каштоўнасці, эстэтычныя густы і этычныя нормы. Сутнаснай асаблівасцю тэатра з'яўляецца яго цесная сувязь з літаратурай. Літаратура – гэта крыніца для тэатральных пастановак. За сваю гісторыю тэатр перажыў нямала трансфармацый, але нязменным заставалася галоўнае – працэс нараджэння сэнсу і каштоўнасцяў. Спектакль, пастаўлены ў тэатры, не растаўляе ўсіх кропак над "і", але нараджае перспектыву сэнсаў, прымушае задумацца. З антычных часоў тэатральнае дзеянне было спалучана з перажываннем асаблівага пачуцця – катарсісу, узвышанага задавальнення і прасвятлення гледача, які перажываў разам з героем сцэнічнага твора пакуты і вызваляўся ад іх праз гэтыя пачуцці. Катарсіс з'яўляецца лакмусавай паперкай якасці драматычнага тэатральнага прадстаўлення.

Шоу не ставіць перад сабой такіх грандыёзных задач, і сувязь з мастацкай літаратурай не з'яўляецца прынцыпам яго функцыянавання. Шоу разлічана не на ўздзеянне на маральныя пачуцці, а на эксплуатацыю чалавечых інстынктаў. Адной з сутнасных характарыстык шоу з'яўляецца геданістычнасць, накіраванасць на асалоду, задавальненне (грэч. Hedone – асалода). Менавіта геданізм ператварае мастацтва ў індустрыю забаў.

Геданізм уласцівы і тэатру. Людзі ходзяць у тэатр таксама за задавальненнем. Але гэта задавальненне іншага роду і іншага парадку. Як пісаў Ю. Бораў, "ёсць задавальненне ад самога працэсу разумення, сузірання як назірання і асэнсавання прадмета мастацтва. Гэта задавальненне са старажытных часоў лічылася вышэйшай асалодай і на Усходзе, і на Захадзе. Здольнасць глыбока разумець мастацкі твор, захапляцца ім – ёсць здольнасць на самым высокім узроўні адчуваць геданістычную функцыю мастацтва" [1, с. 164–168].

Другая сутнасная рыса масавай культуры – карнавальнасць. Паняцце карнавальнай, або смехавой культуры, увёў М. М. Бахцін. Карнавал у Сярэднявеччы – гэта вялікае штогадовае свята перад Вялікім пастом, які суправаджаецца вулічнымі шэсцямі, вулічнымі забавамі. Грамадства на час адмаўляецца ад звыклага ўкладу, саслоўных адрозненняў, апранае маскі. Ідэя карнавала выяўляецца ў інверсіі бінарных апазіцый: дабра – зла, мужчынскага – жаночага, духоўнага – матэрыяльнага і г. д. Менавіта матэрыяльна-цялеснае існаванне чалавека, якое лічыцца афіцыйнай сярэднявечнай культурай грахоўным, з'яўляецца галоўнай тэмай карнавала. Карнавальная культура пераварочвае сацыяльны парадак. Яго героямі становяцца блазны і дурні. Разам з брыдкаслоўем, вулічнай лаянкай, грамадства нібы выплюхвае назапашаную псіхічную энергію, як корак з бутэлькі. Пасля заканчэння карнавала жыццё ўваходзіць у звыклае рэчышча.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Аналізуючы тэндэнцыі развіцця сучаснай культуры, навукоўцы кажуць аб яе татальнай карнавалізацыі. Калі для Сярэднявечча карнавал быў пэўным часам у згодзе, то цяпер канавалалізацыя носіць перманентны характар. Смехавыя жанры з жартамі "ніжэй поясу" трывала прыжыліся на тэлебачанні, у Інтэрнэце. А віртуальная прастора сама па сабе ўяўляе бесперапынны карнавал. "На сярэднявечным карнавале валадараць блазны і дурні ў каўпаках. Але калі мы паглядзім на прастору Інтэрнэту і камунікацыі ў сацыяльных сетках, то выявім вельмі падобныя моманты. Замест каўпакоў і масак – па сутнасці, тое ж самае – нікі, за якімі часта невядома хто хаваецца. Больш за тое, вы можаце стварыць некалькі нікаў і спрачацца з самім сабой. Тут можна бясконца троліць і абражаць іншага. Чым не сярэднявечны карнавал, але на іншым узроўні тэхналагічнага развіцця? Карнавал, які меў у Сярэднявеччы пэўныя часовыя рамкі, у наш час дамінуе паўсюль у выглядзе поп-культуры, якая становіцца пераважнай дзякуючы сучасным масмедыя», – піша сучасны даследчык [4, с. 37].

У выніку ў сферы культуры адбываецца інверсія высокай і нізавой культур, "нізавая культура афіцыйна прызнаецца як яе пераўтвораная форма, яе прадстаўнікі ўдастойваюцца высокіх званняў і ўзнагарод, становяцца героямі, і якая-небудзь эстрадная зорка распавядае, у якіх пакутах творчасці сачыніла бяздарныя вершы" [4, с. 38].

Трэцяй тэндэнцыяй, якая патрабуе аналізу для ўсіх, хто звязаны сёння з гуманітарнай і мастацкай адукацыяй моладзі, з'яўляецца распаўсюджванне кліпавай культуры, новага тыпу свядомасці – "кліпавай свядомасці", якая сфарміравана сучаснымі сродкамі масавай камунікацыі. Кліпавая свядомасць успрымае свет як бясконца зменлівую чараду вобразаў, не звязаных адзінай логікай. Яна здольна да апрацоўкі вялікай колькасці інфармацыі, "умее і любіць хутка перамыкацца паміж разрозненымі сэнсавымі фрагментамі" і аддае перавагу не-тэкставай, візуальнай інфармацыі [5, с. 28]. Панаванне кліпавай свядомасці ставіць пад пытанне існаванне культуры лінейнага тэксту, мастацкай літаратуры. Адваротным бокам медалі хуткасці рэакцыі кліпавай свядомасці з'яўляецца яе няздольнасць да працяглага засяроджвання, да засваення вялікіх фрагментаў лінейнага тэксту, што выклікае неабходнасць перабудовы фактычна ўсіх методык і тэхналогій гуманітарнай адукацыі, якая мае справу з тэкстамі.

Для развіцця мастацкай культуры кліпавае мысленне мае сур'ёзныя наступствы. Яно фарміруе публіку, няздольную да засяроджвання на сэнсавых аспектах. Навукоўцы мяркуюць, што сёння жанрамі, адэкватнымі тыпу кліпавай свядомасці, з'яўляюцца комікс і мюзікл. Комікс замяняе літаратуру, а мюзікл – тэатр. Яго калажная кампазіцыя і выразныя сродкі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

блізкія па тыпу кліпавай свядомасці, таму выклікаюць попыт у сучаснай аўдыторыі [2]. А драматычны тэатр паступова трансфармуецца ў тэатр кароткага спектакля, тэатр мініяцюр, у тэатр стэндапу. Развіваецца такі трэнд як постдраматычны тэатр, які прадстаўлены пошукамі спосабаў "разводу з літаратурай" (візуальны тэатр і інш.)

Гэтыя і іншыя асаблівасці масавай культуры ставяць перад гуманітарнай адукацыяй важную задачу – не дапусціць разбурэння механізму культурнай трансмісіі, перадачы і захавання каштоўнасцяў, этычных, эстэтычных і іншых. Трэба шукаць спосабы быць сучасным і цікавым, не дагаджаючы нізкім густам, захоўваючы статус мастацкага вобраза і годнасць гуманітарыя. Як гэта зрабіць?.. Цяжкае пытанне, і адказы на яго ёсць! Але гэта тэма іншага артыкула.

**Спіс літаратуры**

1. Борев, Ю. Эстетика / Ю. Борев. – М. : Высшая школа, 2002. – 511 с.

2. Брейтбург, В. В. Принцип клипового мышления при создании мюзиклов / В. В. Брейтбур // Культура культуры. 2020. – № 2. [Электрон. ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/printsip-klipovogo-myshleniya-pri-sozdanii-myuziklov. – Дата доступа: 28.03.2021.

3. Массовая культура // Большая российская энциклопедия [Электрон. ресурс]. – Режим доступа: https://bigenc.ru/philosophy/text/2191042. – Дата доступа: 28.03.2021.

4. Миронов, В. В. Трансформация культуры в пространстве глобальной коммуникации / В. В. Миронов. – СПб. : СПбГУП, 2019. – 60 с.

5. Фрумкин, К. Г. Глобальные изменения в мышлении и судьба текстовой культуры / К. Г. Фрумкин // Ineternum. – 2010. – № 1. [Электрон. hесурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/globalnye-izmeneniya-v-myshlenii-i-sudba-tekstovoy-kultury. – Дата доступа: 27.03.2021.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова